Сяргей НОВІКАЎ

# Ліквідацыя слядоў масавых нацысцкіх злачынстваў у Беларусі ў 1943—1944 гг.: да пытання аб дзейнасці "зондэркаманды 1005-Цэнтр"

*У 1941—1944 гг. Беларусь напоўніцу спазнала ўсе праявы акупацыйнай палітыкі нацысцкай Германіі. Асабліва жахлівымі былі масавыя злачынствы захопнікаў, якія знішчылі сотні тысяч савецкіх ваеннапалонных, удзельнікаў партызанскай і падпольнай барацьбы, мірных жыхароў Беларусі, а таксама замежных грамадзян, пераважна яўрэяў з Аўстрыі, Германіі, Чэхаславакіі. Аднак да сённяшняга дня многія абставіны гэтых злачынстваў застаюцца невядомымі. Пачынаючы з 1943 года, калі ў ходзе Вялікай Айчыннай і Другой сусветнай войнаў назіраўся карэнны перелом, кіраўніцтва нацысцкай Германіі праводзіла мэтанакіраваную палітыку па ліквідацыі слядоў сваіх злачынстваў на акупаваных землях. На беларускай зямлі гэтай справай займалася так званая "зондэркаманда 1005-Цэнтр".*

Да цяперашнага часу ў айчыннай гістарыяграфіі няма ніводнай спецыяльнай працы аб дзейнасці "зондэркаманды 1005-Цэнтр", якая з канца лета 1943 г. цягам амаль цэлага года выконвала надзвычай сакрэтную задачу па ліквідацыі слядоў масавых злачынстваў германскіх акупантаў на тэрыторыі Беларусі[1].

Дзейнасць "зондэркаманды 1005-Цэнтр", назва якой паходзіла ад чарговага ўліковага нумара ў бягучым справаводстве Імперскага ведамства бяспекі Германіі (RSHA), была скіраваная на ліквідацыю слядоў масавых злачынстваў на акупаванай савецкай тэрыторыі, у тым ліку тэрыторыі Беларусі. Рэдкія звесткі пра яе, галоўным чынам ускоснага характару, сустракаюцца ў асобных дакументах Надзвычайнай дзяржаўнай камісіі па ўстанаўленні і даследаванні злачынстваў нямецка-фашысцкіх захопнікаў (НДзК) і фігуруюць у паведамленнях некаторых мясцовых жыхароў — сведкаў тых падзей[2]. Аднак у дакументальных матэрыялах, апублікаваных у апошнія гады ў Беларусі, гэты жахлівы факт ваеннай гісторыі Беларусі амаль не адлюстраваны[3].

Навуковы аналіз сведчанняў мясцовых жыхароў пераконвае ў тым, што падчас іх апытанняў прадстаўнікамі НДзК размова часцей за ўсё вялася толькі аб агульных пытаннях, давалася выключна знешняя характарыстыка падзей, пры гэтым не прыводзіліся канкрэтныя дэталі, без якіх цяжка рэканструяваць мерапрыемствы па ліквідацыі слядоў злачынстваў, прывесці дакладныя звесткі, канкрэтныя факты, асобныя імёны іх удзельнікаў і г. д. Таму ў даследчы-



**НОВІКАЎ Сяргей Яўгеньевіч.**

*Загадчык кафедры гісторыі, сусветнай культуры і турызму Мінскага дзяржаўнага лінгвістычнага ўніверсітэта, кандыдат гістарычных навук, дацэнт. Нарадзіўся ў 1954 г. у в. Радзіца Крупскага раёна Мінскай вобласці, у 1980 г. закончыў Мінскі дзяржаўны педагагічны інстытут імя А.М.Горкага. Займаецца даследаваннем эканамічнай гісторыі Беларусі перыяду нацысцкай акупацыі, праблем германскай гістарыяграфіі гісторыі Другой сусветнай вайны і крыніцазнаўства. Аўтар манаграфій "Эканамічная палітыка нацысцкай Германіі ў Беларусі 1941—1944 гг.: агляд крыніц і германскай гістарыяграфіі 1990-х гадоў" (Мн., 2002), "Беларусь у кантэксце германскай гістарыяграфіі гісторыі Другой сусветнай вайны" (Мн., 2004), "Беларусь улетку 1941 года: новыя падыходы ў даследаванні баявых дзеянняў" (Мн., 2015, 2-е выд.), больш за 330 навуковых публікацый. З'яўляецца суредактарам навуковых зборнікаў "Беларусь і Германія: гісторыя і сучаснасць" (Вып. 1—17, Мн., 2002—2019).*

каў узнікалі прынцыпова важныя пытанні: *Наколькі згаданыя сведчанні адпавядаюць іншым крыніцам, у якой ступені ўскосныя звесткі відавочцаў раскрываюць сутнасць гістарычных падзей і ці могуць яны вытрымаць праверку верыфікаванымі дакументамі?* У выніку — *Ці могуць і надалей заставацца адзінымі крыніцамі для ўсебаковага вывучэння гэтай малавядомай гістарычнай праблемы?*

Выключэннем сярод гэтых сведчанняў з'яўляецца "Заява жыхара в. Прысна Магілёўскага раёна С.І.Пілунова начальніку Беларускага штаба партызанскага руху П.З.Калініну" ад 20 мая 1944 г. С.І.Пілуноў фактычна адзіны з мясцовых жыхароў, прыцягнутых да выканання работ "зондэркамандай-1005", каму ўдалося выратавацца. Ён пакінуў унікальныя звесткі аб ліквідацыі слядоў злачынстваў у раёне Магілёва, Азарычаў і Гомеля шляхам спальвання парэштак забітых савецкіх грамадзян, распавёў пра канкрэтныя месцы, прывёў дакладныя звесткі і згадаў малавядомыя лічбы аб маштабах нацысцкіх злачынстваў, сляды якіх спрабавала ліквідаваць спецыяльна створаная для гэтага аператыўная каманда 1005 у ходзе сакрэтнай аперацыі на тэрыторыі Магілёўшчыны і Гомельшчыны ўвосень 1943 г.[4]. Нагадаем, што С.І.Пілуноў быў арыштаваны гестапа г. Магілёва ў ліпені 1943 г. пасля таго, як у рукі паліцыі трапілі дакументы забітага камандзіра 121-га партызанскага атрада А.І.Якубава, дзе згадвалася яго прозвішча. Пасля арышту ён амаль два месяцы знаходзіўся ў памяшканні гарадской тайнай паліцыі, дзе не раз быў дапрошаны. У пачатку кастрычніка яго перавялі ў гарадскую турму. Менавіта з вязняў магілёўскай турмы складалася рабочая каманда, якая 4 кастрычніка прыступіла да выканання работ па ліквідацыі слядоў масавых забойстваў у раёне в. Пашкава Магілёўскага раёна. Праз месяц, як адзначана ў заяве С.І.Пілунова, калі былі завершаны работы па ліквідацыі каля 35 тысяч трупаў, гэтую каманду перавялі ў раён в. Палыкавічы Магілёўскага раёна, дзе яму ўдалося збегчы[5]. Адзначым, што ў матэрыялах НДзК прыводзіцца толькі згадка пра падзеі ў Магілёўскім раёне, звязаныя з дзейнасцю германскіх акупантаў па ліквідацыі слядоў злачынстваў шляхам *"выкопвання і спальвання трупаў забітых"*, аднак без згадкі канкрэтных месцаў, дзе гэта адбывалася, без спасылак на заяву С.І.Пілунова, упершыню апублікаваную ў 1965 г.[6].

З улікам гэтай малавядомай дакументальнай крыніцы разгледзім іншыя матэрыялы, уведзеныя НДзК у шырокі зварот. Так, "Акт мінскай абласной камісіі аб масавым знішчэнні савецкіх грамадзян на тэрыторыі гор. Мінска і яго ваколіц нямецка-фашысцкімі захопнікамі ў 1941—1944 гг." ад 13 жніўня 1944 г. упершыню згадваў *"спальванне трупаў"* людзей з мэтай утойвання нямецка-фашысцкімі забойцамі слядоў сваіх злачынстваў у ваколіцах Мінска, у тым ліку на хутары Пятрашкевіча, ва ўрочышчах Благаўшчына і Шашкоўка, у адрыне каля вёскі Малы Трасцянец пад Мінскам[7]. Аднак згаданыя факты так і не сталі прадметам даследавання для беларускай савецкай гістарыяграфіі, як і не з'яўляюцца сферай вывучэння сучаснай айчыннай гістарычнай навукі[8]. Адной з прычын гэтага бачыцца амаль поўная адсутнасць дакументальных крыніц, без якіх немагчыма даць адказы на пытанні, датычныя вызначэння вайсковай ці паліцэйскай прыналежнасці падраздзялення, якое выконвала такія задачы, яго складу, структуры і функцый, а таксама даведацца пра лёс удзельнікаў спецыяльных рабочых каманд (мясцовых жыхароў ці савецкіх ваеннапалонных).

Аўтары навукова-папулярнага выдання "Трасцянец. Трагедыя народаў Еўропы", якое выйшла ў 2018 г., Н.А.Яцкевіч і М.Г.Нікіцін сцвярджаюць наступнае: *"У перыяд з кастрычніка 1943 г. па сакавік 1944 г. зондэркаманда "1005 Цэнтр" раскапала і спаліла ў Благаўшчыне 125 тысяч трупаў"*[9]. Адразу звернем увагу чытача на два істотна важных моманты ў прыведзенай цытаце: па-першае, на храналагічныя рамкі дзейнасці зондэркаманды, якія не пацвярджае ні адзін нямецкі дакумент; па-другое, на лічбу спаленых у Благаўшчыне трупаў, што значна адрозніваецца ад лічбаў Мінскай абласной камісіі садзейнічання НДзК. Як вядома, у дакуменце камісіі была прыведзена дакладная лічба ў 150 тысяч. Аўтары названай працы не спасылаюцца на архіўныя ці іншыя матэрыялы, на падставе якіх вызначаюць гэтую лічбу і перыяд дзейнасці "зондэркаманды 1005-Цэнтр" ва ўрочышчы Благаўшчына (па дакументах судовага працэсу ў Гамбургу ў дачыненні да начальніка 9-й танкавай паліцэйскай роты старшага лейтэнанта О.Гольдапа, той называў дакладную дату апошняга дня работы каманды — 15 снежня 1943 г.).

Таму ўзнікае лагічнае пытанне, на падставе якіх крыніц уводзяцца ў шырокі ўжытак звесткі, што адрозніваюцца ад агульнапрынятых. Гэта надзвычай важна, паколькі новае выданне адрасавана не толькі беларускамоўнай, але і англа- і рускамоўнай аўдыторыі, г. зн. уводзіць факты беларускай ваеннай гісторыі ў еўрапейскі кантэкст. Адзначым, што на цяперашні час у сучаснай нямецкай гістарыяграфіі замацаваны іншыя ацэнкі, зробленыя нямецкімі даследчыкамі, якія рыхтавалі свае працы на падставе дакументальных крыніц. Такім чынам, уведзеныя ў згаданым выданні лічбы ствараюць сур'ёзныя праблемы для даследчыкаў.

Існення перад беларускімі даследчыкамі стаіць даволі складаная праблема вывучэння падзей, звязаных з ліквідацыяй слядоў нацысцкіх злачынстваў на тэрыторыі Беларусі ўвогуле і ў кожным канкрэтным месцы ў прыватнасці. Яе складанасць заключаецца ў першую чаргу ў тым, што службы паліцыі і СД, якія

забяспечвалі выкананне задачы па ліквідацыі слядоў злачынстваў на акупаванай усходняй тэрыторыі, здолелі знішчыць абсалютную большасць дакументаў "зондэркаманды 1005-Цэнтр", без якіх складана весці ўсебаковае навуковае даследаванне па згаданай тэме.

Цяпер неабходна весці размову не толькі пра добра вядомы след злачынстваў, пакінуты "зондэркамандай 1005-Цэнтр" у раёне Трасцянца пад Мінскам, а разглядаць у гэтым кантэксце і іншыя месцы на тэрыторыі Беларусі, дзе з *"мэтай спальвання трупаў"* гарэлі вогнішчы як у зоне дзейнасці германскай ваеннай (Гомель, Рагачоў, Бабруйск, Магілёў, Орша, Полацк, Віцебск, Барысаў, Крупкі, Лепель), так і цывільнай адміністрацыі (Баранавічы, Бронная Гара, Бяроза-Картузская, Вілейка, Гродна, Іванава, Кобрын, Маладзечна, Мір, Слонім, Слуцк, Смалявічы, Пінск), пра што вядома з прац нямецкіх гісторыкаў. Адсутнасць дакументальных крыніц па згаданай праблеме ў беларускіх даследчыкаў пакідае яе разгляд на ўзроўні традыцыйных абагуленых, а не канкрэтных ацэнак, калі карціна ліквідацыі слядоў масавых нацысцкіх забойстваў адлюстроўваецца катэгорыямі, фактамі і ацэнкамі з успамінаў, чутак, размоў не непасрэдных, а ускосных відавочцаў. Паколькі фактычных відавочцаў ці ўдзельнікаў тых "брыгад смяротнікаў", як іх называлі былыя вязні, каму ўсё-такі ўдалося выратавацца, намі ў Беларусі не выяўлена. Выключэннем тут з'яўляецца, як адзначалася вышэй, толькі С.І.Пілуноў.

З нямецкіх дакументаў вядома, што ў адпаведнасці з сакрэтнымі інструкцыямі Імперскага ведамства бяспекі пры завяршэнні аперацыі па ліквідацыі слядоў нацысцкіх злачынстваў непасрэдныя выканаўцы работ з нямецкага боку не павінны былі пакідаць сведак, пазбаўляючы жыцця ўдзельнікаў рабочых каманд, якія набіраліся з вязняў бліжэйшых лагераў ці ваеннапалонных. І гэты было невыпадкова, паколькі з нямецкага боку гэтая аперацыя праходзіла пад кодавай назвай *"сакрэтная дзяржаўная справа"*. Менавіта таму на сённяшні даследчыкам удалося знайсці літаральна адзінкавыя арыгінальныя дакументы Імперскага ведамства бяспекі часоў вайны. Вялікую колькасць матэрыялаў, якія праліваюць святло на гісторыю правядзення строга сакрэтнай аперацыі "зондэркамандай 1005-Цэнтр" на акупаванай тэрыторыі Беларусі ў 1943—1944 гг., пакінулі судовыя працэсы над злачынцамі.

Такім чынам, перад даследчыкамі паўстае галоўная задача — паспрабаваць правесці рэканструкцыю падзей на базе выяўленых і ўведзеных у навуковы ўжытак арыгінальных крыніц ці новых даследаванняў. Зразумела, што тут варта адмовіцца ад аднабаковай інтэпрэтацыі матэрыялаў пры ацэнцы рэальных падзей, паспрабаваць максімальна поўна выкарыстаць існуючую на цяперашні час базу крыніц, у тым ліку "эга-дакументаў", выяўленых, сістэматызаваных і ўведзеных у навуковы ўжытак нямецкімі даследчыкамі. На наш погляд, такое даследаванне трэба правесці: па-першае, каб увесці ў навуковы ўжытак адну з малавядомых старонак гісторыі Беларусі 1943—1944 гг.; па-другое, каб удакладніць асобныя старонкі ваеннай паўсядзённасці на рэгіянальным і лакальным узроўнях, у тым ліку ў колькасным вымярэнні; па-трэцяе, каб вярнуць у пантэон памяці невядомыя месцы ліквідацыі слядоў масавых нацысцкіх злачынстваў і імёны людзей, якія нацысцкія злачынцы імкнуліся назаўсёды выкрэсліць з гістарычнай памяці.

Такі падыход нам бачыцца цалкам лагічным і вынікае з таго, што да гэтага часу ў беларускай гістарычнай навуцы адсутнічае спецыяльнае навуковае даследаванне, якое б паказвала агульную карціну дзейнасці "зондэркаманды 1005-Цэнтр" на тэрыторыі Беларусі. Яе разгляд сёння неабходна праводзіць як важны крок для захавання памяці пра тых людзей, якіх знішчылі нацысцкія забойцы. Неабходна назваць саміх забойцаў, паколькі іх рукамі вяршыліся маштабныя злачынствы на беларускай зямлі. Усе падзеі і факты павінны разглядацца з улікам рэалій мінулага. Разгляд гэтых фактаў можа назаўсёды пакінуць след у памяці сучаснікаў, для якіх падзеі трагічнага мінулага не заўсёды з'яўляюцца прадметам штодзённага інтарэсу. Таму нам патрэбна аб'ектыўная гісторыя, падзеі якой вывучаны на аснове дакументальных крыніц рознага паходжання, у тым ліку гістарыяграфічных.

У аснову артыкула аўтарам пакладзены аналіз фактаў, прадстаўленых у працах нямецкіх аўтараў гісторыка А.Ангрыка і журналіста Е.Хофмана. У фокус іх даследаванняў патрапіла тэма, якая раней не з'яўлялася прадметам спецыяльных прац, нават грунтоўнага даследавання аб нацысцкіх злачынствах у Беларусі К.Герлаха[10]. Зварот да абодвух выданняў дае магчымасць не толькі пазнаёміцца з малавядомымі старонкамі гісторыі Беларусі, але і вырашыць некалькі навуковых задач: па-першае, пазнаёміць шырокую грамадскасць з новымі падыходамі да даследавання гісторыі нацысцкіх злачынстваў у Беларусі; па-другое, выявіць малавядомыя аспекты гісторыі масавага знішчэння людзей на тэрыторыі лагера смерці Трасцянец; па-трэцяе, пашырыць крыніцазнаўчую базу для далейшай аб'ектыўнай рэканструкцыі гісторыі германскага акупацыйнага рэжыму ў Беларусі ў 1941—1944 гг.

## Даследаванне Андрэя Ангрыка

Грунтоўнае даследаванне А.Ангрыка "Акцыя 1005" — ліквідацыя слядоў нацысцкіх злачынстваў у 1942—1945 гг. Адна "сакрэтная дзяржаўная справа" ў полі напружанасці паміж паваротам у вайне і прапагандай" выйшла ў нямецкім горадзе Гёцінген у верасні 2018 г.[11]. Вядомы ваенны гісторык (у першую чаргу дзякуючы даследаванням па гісторыі дзейнас-

ці "зондэркаманды Д" на поўдні акупаванай савецкай тэрыторыі ў 1941—1942 гг.[12]) на гэты раз звяртаецца да падзей на тэрыторыі Беларусі ў 1943—1944 гг., прапаноўваючы беларускаму чытачу малавядомыя сюжэты аб гісторыі правядзення "зондэркамандай 1005-Цэнтр" спецыяльнай аперацыі па ліквідацыі слядоў нацысцкіх злачынстваў. У больш чым 1300-старонкавым даследаванні Беларусі прысвечана адна з трох падглаў "Зондэркаманда 1005-Цэнтр у Беларусі" (74 старонкі, с. 558—631) трэцяй часткі "Выпаленыя просекі ў тыле групы армій Цэнтр і Беларусі" працы нямецкага гісторыка. У кнізе даследчык разглядае фактычна ўсю еўрапейскую тэрыторыю, на якой падраздзяленні паліцыі, службы СД з удзелам германскага вермахта пакінулі сляды масавых забойстваў, у тым ліку на тэрыторыі Беларусі. Задачу па іх ліквідацыі вышэйшае нацысцкае кіраўніцтва паставіла ў парадак дня пасля краху плана "Барбароса".

У гэтай падглаве А.Ангрык паказвае ў храналагічным парадку падзеі, звязаныя з правядзеннем сакрэтнай аперацыі па ліквідацыі слядоў нацысцкіх злачынстваў на тэрыторыі Беларусі ў 1943 г. Даследуючы акцыі па масавых забойствах на акупаванай савецкай тэрыторыі, аўтар вызначае адметны факт, ад якога пачала адлік "акцыя 1005-Цэнтр" — разгром германскіх войскаў на Курскай дузе, які падштурхнуў вышэйшае кіраўніцтва Імперскага ведамства бяспекі прыняць рашэнне аб стварэнні мабільных каманд, якія б праводзілі работы па эксгумацыі на месцах масавага знішчэння перад адступленнем вермахта на захад. У жніўні разам з "зондэркамандамі 1005-А і 1005-Б" была створана "зондэркаманда 1005-Цэнтр (Mitte)", на чале якой быў пастаўлены былы кіраўнік зондэркаманды 4а штандартэнфюрэр СС Паўль Блобель[13]. Для захавання ў сакрэце дзейнасці гэтай каманды выкарыстоўвалася шыфраваная перадача даных — у Імперскае ведамства бяспекі ў Берліне, *"зводкі пра надвор'е"*, *"вырубка лесу"* і інш.[14]. Так, пад звесткамі аб *"вышыні аблокаў"* мелася на ўвазе колькасць спаленых трупаў, а пад *"ападкамі"* —


Andrej Angrick
»Aktion 1005« – Spurenbeseitigung von NS-Massenverbrechen
1942–1945
*Eine »geheime Reichssache« im Spannungsfeld von Kriegswende und Propaganda*
Band 1
Wallstein Verlag

*Тытульны аркуш кнігі А.Ангрыка.*




*Карта-схема тэрыторыі дзеяння "зондэркаманды 1005-Цэнтр".* Пазначаны "штабелі для спальвання трупаў", "канцлагеры і лагеры", акупацыйныя адміністрацыйна-тэрытарыяльныя адзінкі, лінія фронту на розны час.

колькасць задзейнічаных у работах каманды мясцовых вязняў, якія падлягалі ліквідацыі.

У дачыненні да тэрыторыі Беларусі, дзе ў пачатку восені прыступіла да дзейнасці "зондэркаманда 1005-Цэнтр", П.Блобель бачыў вырашэнне адразу дзвюх важных задач: першай — *"ускрыццё"* масавых пахаванняў на тэрыторыі, падпарадкаванай германскай ваеннай адміністрацыі; другая — ліквідацыя шматлікіх *"палёў пахаванняў"* на тэрыторыі Генеральнага камісарыяту Беларусь. Гэтыя распараджэнні ён аддаваў ужо са штаба айнзацгрупы Б, у якім знаходзіўся з сярэдзіны верасня 1943 г. (S. 518).

Нагадаем чытачу, што дзейнасць "зондэркаманды 1005-Цэнтр" па ліквідацыі слядоў нацысцкіх злачынстваў на тэрыторыі Беларусі вялася з улікам практычнага досведу, атрыманага ва Украіне, дзе гэтыя работы распачаліся яшчэ ў жніўні — верасні 1943 г., спачатку ва Львове, а потым у Кіеве (па ліквідацыі слядоў масавых расстрэлаў у раёне Бабія Яра). З цягам часу справа па знішчэнні слядоў нацысцкіх злачынстваў набыла сістэматычны характар, асабліва пасля таго, як летам 1943 г. у Львове для будучых кіраўнікоў "акцыі 1005" была праведзена кароткатэрміновая падрыхтоўка на прыкладзе пахаванняў у раёне Янаўскага лагера. Яна павінна была ўключаць: 1) забеспячэнне спецыяльнай аховы з часцей паліцыі, СД і СС з улікам аб'ёму запланаваных работ; 2) фарміраванне рабочай каманды, г. зв. "каманды смяротнікаў" для выканання работ па адкрыцці пахаванняў, далейшай эксгумацыі і спальванні трупаў; 3) арганізацыя часовых збудаванняў у форме зямлянак для ўтрымання рабочых каманд, укамплектаваных з вязняў мясцовых гета, турмаў, лагераў для ваеннапалонных і часам прыцягнутага да гэтага грамадзянскага насельніцтва; 4) нарыхтоўка дроў ці іншых гаручых матэрыялаў для правядзення работ па спальванні эксгумаваных трупаў; 5) "спальванне трупаў" на вогнішчах у штабелях ці ў спецыяльна збудаваных у зямлі печах; 6) ліквідацыя рэштак костак пасля спальвання шляхам раздраблення; 7) пазбаўленне сведкаў, г. зн. ліквідацыя рабочых каманд шляхам іх расстрэлу і спальвання; 8) ліквідацыя слядоў злачынстваў на месцы правядзення работ. Гэтымі правіламі кіраваліся ўсе падраздзяленні "зондэркаманды 1005-Цэнтр", якія забяспечвалі правядзенне згаданых работ на тэрыторыі Беларусі, у тым ліку ва ўрочышчы Благаўшчына каля Трасцянца. Апроч таго, "акцыя 1005" павінна была праводзіцца з асаблівай педантычнасцю — забаранялася распаўсюджанне любых звестак пра яе правядзенне, склад каманд аховы і вынікі іх дзейнасці.

З мэтай каардынацыі работ у канцы верасня 1943 г. у Магілёве была праведзена сустрэча кіраўнікоў зондэр- і айнзацкаманд айнзацгрупы Б, якія дзейнічалі ў зоне тылу групы армій "Цэнтр". Па выніках сустрэчы, на якой таксама прысутнічалі начальнікі паліцыі Бабруйска, Гомеля і Віцебска, быў аддадзены загад, паводле якога кожная з вышэйзгаданых структур стварала спецыяльнае падраздзяленне для *"агідных работ"*, правядзенне якіх мусіла забяспечвацца шляхам прыцягнення вязняў з бліжэйшых лагераў. Апроч таго, у той жа дзень каля вёскі Пашкава побач з Магілёвам было арганізавана *"паказальнае спальванне"* трупаў 100 мясцовых грамадзян (расстраляных перад гэтым), складзеных у спецыяльнае вогнішча, падчас якога прысутнічалі таксама прадстаўнікі каманд СД з Бабруйска, Гомеля, Віцебска, Магілёва і Мінска. У якасці найбольш прымальнай методыкі ўтрымання работнікаў спецыяльных каманд было прапанавана выкарыстоўваць *"кіеўскую мадэль"*, паводле якой прыцягнутыя да работ вязні цягам дня павінны былі знаходзіцца пад пастаяннай аховай, а ўначы размяшчаліся ў спецыяльна пабудаваных зямлянках, іх прымацоўвалі адзін да аднаго пры дапамозе лан-




*Зона дзейнасці "зондэркаманды 1005-Цэнтр" на тэрыторыі "Мінска і ваколіц", Беларусі.*
Пазначаны "штабелі для спальвання трупаў", "канцлагеры і лагеры", шлях гэтай каманды.

цугоў, якія здымалі на дзень, калі каманда пакідала месца начоўкі. Уваход у зямлянку разлічаны на праход аднаго чалавека, што было зроблена спецыяльна каб не дапусціць спроб уцёкаў (S. 526-527).

На прыкладзе Барысава А.Ангрык паказвае, што існавалі і іншыя метады абыходжання з вязнямі "каманд смяротнікаў". Так, для іх начовак падчас правядзення ў лістападзе 1943 г. работ на тэрыторыі былой фабрыкі "Камінтэрн", дзе за часам вайны знаходзіўся лагер, выкарыстоўваліся "газавыя аўтамабілі". У іх кузаве шначы спала ад 80 да 100 чалавек. Пасля таго як работы былі завершаныя на тэрыторыі лагера службамі гестапа і СД былі забітыя ад 2000 да 3000 вязняў самога лагера: жанчын і мужчын, дзяцей, людзей сталага ўзросту (S. 540-541).

Для выканання задач па ліквідацыі слядоў сваіх злачынстваў у Бабруйску "зондэркаманда 1005-Цэнтр" прыцягвала асобныя падраздзяленні часцей СД. Так, зондэркаманда 7б, што знаходзілася ў раёне Бабруйска, павінна была вырашыць тры задачы: 1. сабраць людзей для выкарыстання ў якасці рабочай сілы на будаўніцтве палявых умацаванняў; 2. ліквідаваць палітычных працаўнікоў і *"лішніх людзей"*, якія ўжо не былі патрэбныя акупацыйным органам; 3. ліквідаваць сляды месцаў масавых забойстваў. У ходзе правядзення работ у самім горадзе і каля яго з восені 1943 г. па пачатак 1944 г. былі ліквідаваныя тры месцы з пахаваннямі — каля вёсак Каменка і Ялоўка, а таксама на старых яўрэйскіх могілках у самім горадзе. Іншыя месцы ў сувязі з моцнымі маразамі і немагчымасцю адкрыцця пахаванняў зондэркаманда паспрабавала замаскіраваць. Пахаванні на тэрыторыі крэпасці, дзе знаходзіўся лагер для ваеннапалонных, што ўтрымлівалі амаль 40 000 трупаў, планавалася ўзараць і такім чынам канчаткова пахаваць рэшткі забітых. Апроч таго, у поле дзейнасці каманды трапіў лясны лагер, дзе з канца лета 1942 г. выкарыстоўваліся каля 1500 вязняў варшаўскага гета, большасць з якіх колькасцю каля 1400 чалавек, былі расстраляныя на прылеглай тэрыторыі цягам наступнага года (S. 543).

Аб тым, як праводзіліся работы на месцы ліквідацыі слядоў масавых забойстваў, у даследаванні даецца дэталізаваная карціна на падставе ўспамінаў Сцяпана Іванавіча Пілунова, на сёння адзінага выжыўшага сведкі з соцень тых, хто трапіў у "каманды смяротнікаў" у Беларусі. Нагадаем, што 4 кастрычніка 1943 г. ён быў дастаўлены ў раён вёскі Пашкава, каля якой знаходзілася балоцістая мясцовасць, дзе ў радыусе прыблізна 300 м была ачэпленая зона, яе ахову забяспечвалі салдаты з сабакамі, а паабапал высіліся вышкі з усталяванымі на іх кулямётамі. Цягам двух тыдняў тут працавала "каманда смяротнікаў" групамі па 12—20 чалавек, якія ўскрывалі пахаванні, размяшчалі трупы на бярвеннях, пакладзеных на рэйкі, у штабялі вышынёй да 4 м, а потым іх спальвалі. У выпадку, калі пасля гэтага заставаліся не спаленыя цалкам косткі, іх трушчылі пры дапамозе спецыяльных драўляных прыстасаванняў. У выніку тут такім чынам было спалена каля 25 тысяч трупаў (S. 548).

Разглядаючы дзейнасць па ліквідацыі слядоў нацысцкіх злачынстваў у раёне Віцебска, Полацка, Лепеля, якую ажыццяўляла спецыяльнае падраздзяленне "зондэркаманды 1005-Цэнтр" — "айнзацкаманда 9", аўтар канстатуе, што ў выніку ўсе работнікі "каманды смяротнікаў" былі знішчаныя.

У раздзеле "Зондэркаманда 1005-Цэнтр у Беларусі" (S. 558—631) А.Ангрык засяроджвае сваю ўвагу на адным з галоўных аб'ектаў на тэрыторыі Генеральнага камісарыята "Беларусь" — цэнтры масавага знішчэння ў Благаўшчыне каля вёскі Малы Трасцянец. П.Блобель прызначыў кіраўніком каманды для правядзення аперацыі па ліквідацыі слядоў масавага знішчэння ў раёне Мінска камандзіра службы бяспекі палкоўніка паліцыі Эрыка Эрлінгера[15]. Пад кіраўніцтвам апошняга завяршылася ліквідацыя мінскага гета і былі праведзены падрыхтоўчыя работы да эксгумацыі і ліквідацыі парэшткаў загубленых ва ўрочышчы Благаўшчына (нарыхтоўка неабходных прылад і матэрыялаў, у тым ліку насілак, крукоў, шufляў, малаткоў і кувалдаў для драблення касцей, сітаў для прасейвання попелу, кіслаты для апрацоўкі металаў, а таксама маторных піл). Аўтар згадвае, што камандзір мінскага СД вёў асобнае справаводства, у якім захоўвалася картатэка на вязняў мінскага гета, меўся план размяшчэння іх пахаванняў, а таксама вёўся дзённік аб дзейнасці каманды 1005-Цэнтр. Заўважым, што да гэтага часу беларускім даследчыкам згаданыя дакументы не сустракаліся.

А.Ангрык адзначыў, што пры Э.Эрлінгеры Малы Трасцянец стаў *"бастыёнам па ліквідацыі слядоў"* (S. 563). Заўважым, што пры апісанні месца знаходжання і функцый лагера нямецкі аўтар дапускае пэўныя недакладнасці. Па-першае, што тычыцца прывязкі месца знаходжання ўрочышча Благаўшчына адносна дарогі, побач з якой быў гэты аб'ект, згадваецца паварот з дарогі Мінск — Смілавічы, што не адпавядае рэчаіснасці. Па-другое, з датай стварэння працоўнага лагера ў раёне Малога Трасцянца (называецца лістапад 1941 г.), які з цягам часу павінен быў стаць *"цэнтрам забойстваў"* для беларускіх яўрэяў. На наш погляд, такім цэнтрам працоўны лагер быць не мог, паколькі ён мусіў выкарыстоўвацца для ўтрымання вязняў пад наглядам паліцыі, а не для іх фактычнага знішчэння, для чаго прадугледжвалася ўрочышча Благаўшчына. Па-трэцяе, аўтар адзначае, што масавыя забойствы яўрэяў з Германіі, Аўстрыі і пратэктарату Багемія і Маравія пачаліся тут з лета 1942 г. Насамрэч лагер для ўтрымання вязняў каля вёскі Малы Трасцянец быў створаны толькі ў канцы красавіка 1942 г., а першыя яўрэі з Вены ў Благаўшчыне былі знішчаныя 11 мая 1942 г. (S. 563).

Аўтар называе агульную лічбу амаль ў 205 тысяч чалавек, знішчаных у раёне Трасцянца, але пры гэтым адзначае, што выкарыстоўвае ў гэтым выпадку *"няправераныя даныя"*, спасылаючыся на гістарычныя працы, у якіх сустракаецца лічба *"не менш за 60 тысяч чалавек"*. У першым выпадку заўважым, што можна працягваць весці навуковы пошук адказаў на пытанне аб агульнай колькасці ахвяр у раёне Трасцянца, пра што ў айчыннай гістарыяграфіі толькі ў апошні час пачалася сур'ёзная размова[16], аднак, паводле дакументаў Надзвычайнай дзяржаўнай камісіі, гэтая лічба складала 206 500 чалавек[17].

У працы прыводзяцца цікавыя звесткі пра склад "зондэркаманды 1005-Цэнтр", у якую ўваходзілі služачыя мінскага гестапа і СД, ахоўнай паліцыі, узмоцненай за кошт прадстаўнікоў 9-й танкавай паліцэйскай роты, а таксама фольксдойчэ з роты СД. Каманду апроч Э.Эрлінгера з 27 кастрычніка па 15 снежня 1943 г. узначальвалі афіцэры Зэекель і Кранэр. Працаваў у ёй і штурмшарфюрэр СС А.Рубэ, які раней служыў назіральнікам у мінскім гета. У "зондэркамандзе" яго паўнамоцтвы распаўсюджваліся на адкрыццё пахаванняў, складванне трупаў у штабелі і іх спальванне. Як відавочца забойстваў, ён добра ведаў месцазнаходжанне пахаванняў. Апроч таго, яму дапамагалі іншыя служачыя і перакладчыкі з мінскага СД, якія прыбылі з Кіева разам з першым камандзірам каманды Э.Эрлінгерам.

Значна большы інтарэс у беларускага чытача могуць выклікаць звесткі пра "каманду смяротнікаў", складзеную выключна з вязняў мясцовых лагераў. На аснове здабытага ў Кіеве досведу для яе часовага прытулку планавалася пабудаваць прыстанішча ў форме зямлянкі, аднак з пэўнай мадыфікацыяй. Вопыт Кіева паказаў, што ўваход у зямлянку неабходна рабіць такім вузкім, каб мог праціснуцца толькі адзін чалавек, што перасцерагала ад спроб масавых уцёкаў. Начаваць вязні маглі толькі лежачы на баку адзін каля аднаго. У выпадку халоднага надвор'я прадугледжвалася ўстаноўка печы для ацяплення. Самыя вялікія цяжкасці выклікала забеспячэнне вадой (S. 568).

Першая "каманда смяротнікаў" са 100 вязняў была сабраная з лагера паліцыі бяспекі на вуліцы Шырокай у Мінску (яе складалі яўрэі, пакінутыя падчас ліквідацыі мінскага гета) і размешчаная ў турме СД. Пазней яе работнікаў знішчылі ва ўрочышчы Благаўшчына каля вёскі Малы Трасцянец. У склад другой каманды былі сабраныя прадстаўнікі "рускіх" яўрэяў, у тым ліку беларускіх, і мясцовыя грамадзяне, якія па розных прычынах утрымліваліся ў турме СД. Паводле загаду П.Блобеля, па меры канчатковай ліквідацыі слядоў забойстваў рабочыя каманды падлягалі знішчэнню на месцы правядзення работ (S. 570).

*"Рабочыя ўмовы"* для дзейнасці "зондэркаманды 1005-Цэнтр" былі забяспечаныя толькі пасля прыбыцця дастатковай колькасці персаналу для аховы самога месца знішчэння ў Благаўшчыне і яе бліжэйшых ваколіц пад камандаваннем лейтэнанта ахоўнай паліцыі О.Гольдапа. Кіраўніцтва каманды абсталявалася ў штабным вагончыку, з якога можна было назіраць за правядзеннем работ. Для часовага размяшчэння самой каманды была ўсталявана фінская палатка, якая знаходзілася на аддаленні 100 м ад месцаў пахавання. Харчаванне каманды забяспечвалася на месцы.

Пабудова зямлянкі для рабочай каманды пачалася адначасова з правядзеннем работ па адкрыцці месцаў пахаванняў у Благаўшчыне. Паліцыя бяспекі аддала загад мясцовым сялянам аб выдзяленні падвод, нарыхтоўцы і дастаўцы лесу на "13 км" шашы Мінск — Магілёў. На працягу першага тыдня вязні рабочай каманды вечарам адвозіліся ў мінскую турму, дзе для іх былі выдзелены 5 асобных камер. На пяты дзень была гатовая зямлянка, пасля чаго рабочая каманда заставалася на месцы. З улікам вопыту, атрыманага ў раёне Бабія Яра, калі работнікі "каманды смяротнікаў" падрыхтвалі і ажыццявілі ўцёкі, было загадана зрабіць невялікія шахты для вентыляцыі, праз якія ўначы можна было б падслухоўваць размовы рабочых.

Аўтар даследавання звяртае ўвагу на тэхналогію спальвання трупаў з улікам кіеўскага досведу, пасля таго, як яны былі выцягнутыя, раскладзеныя і падрыхтаваныя для больш хуткага спальвання. Гэта спрыяла таму, што падпалены штабель гарэў на ўсю моц, у той час як другі ўжо рыхтаваўся. Камандзір "зондэркаманды 1005-Цэнтр" рэгулярна адпраўляў на адрас РСХА ў Берлін інфармацыю аб колькасці эксгумаваных трупаў (S. 575). Інфармацыя аб дзейнасці каманды ў Мінску і вакол яго не была сакрэтнай, гэтак жа як і аб знішчэнні яўрэяў. У Благаўшчыне гэтай аперацыяй кіравалі апроч Эрлінгера таксама Зэекель і Кранэр. 15 снежня тэрыторыя гэтага ўрочышча была канчаткова *"ачышчана"*, *"усе косці размолатыя"*, і *"штабелі з трупамі спаленыя"*. Рабочая каманда засыпала цалкам ямы, у якіх ужо не было парэшткаў ахвяр. Удзельнікі рабочай каманды, пасля заканчэння "працы", што цягнулася 6 тыдняў, былі ліквідаваныя на месцы — у Благаўшчыне (S. 581). На месцы знішчэння ў Шашкоўцы падобныя работы праводзіла "малая рота" — невялікая група з фольксдойчэ на чале з гаўптшарфюрэрам Рыдэрам.

А.Ангрык знаёміць чытача і з іншымі месцамі правядзення падобных работ на тэрыторыі Беларусі, дзе дзейнічалі невялікія падраздзяленні гэтай каманды. Так, напрыклад, у пачатку мая 1944 г. у раёне Броннай Гары работы па ліквідацыі слядоў нацысцкіх забойстваў павінна была праводзіць каманда з 30 чалавек — 20 паліцэйскіх аховы, 6 служачых з падраздзялення СС, 3 прадстаўнікоў паліцыі бяспекі і аднаго перакладчыка. Адпаведна загаду, ім неабходна бы-




*Схема размяшчэння пахаванняў у раёне Броннай Гары. Пазначаны "ямы з трупамі", "штабелі для спальвання трупаў", тэрыторыя абнесеная калючым дротам.*

ло арганізаваць працу на вядомай "будоўлі", пад якой мелася на ўвазе месца масавых забойстваў у раёне Броннай Гары. Паводле Акта Брэсцкай абласной камісіі садзейнічання НДзК ад 15 верасня 1944 г., у гэтым месцы былі знішчаныя больш за 50 тысяч савецкіх грамадзян, пахаваных у 8 ямах. Паводле звестак, агучаных на судовым працэсе ў Гамбургу, ліквідацыя слядоў пачалася ў маі і працягвалася 15 сутак. Пасля таго як былі забітыя каля 100 чалавек рабочай каманды, складзенай з мясцовых жыхароў і вязняў лагераў, на месцы правядзення работ былі высаджаныя маладыя дрэўцы, каб схаваць сляды дзейнасці "зондэркаманды 1005-Цэнтр". Аднак прадстаўнікі НДзК, як адзначае нямецкі аўтар, выявілі на гэтым месцы рэшткі не да канца спаленых касцей, жаночыя грабяні, дзіцячы абутак, савецкія грошы і іншыя рэчы. У даследаванні адзначана, што Бронная Гара стала цэнтрам масавых забойстваў, куды чыгункай дастаўляліся мясцовыя жыхары, большай часткай яўрэі з гета Антопаля, Бярозы, Гарадца, Драгічына, Іванава, а таксама з Пінску і Кобрына (S. 608).

Такім чынам, у даследаванні А.Ангрыка адлюстравана карціна дзейнасці "зондэркаманды 1005-Цэнтр" не толькі ў раёне Трасцянца, але і ў іншых месцах: паводле прыведзеных у даследаванні звестак, у 1944 г. работы праводзіліся ў раёне Смалявічаў, Маладзечна, Пінска, Заполля, Янава, Лунінца, Кобрына, Броннай Гары, Бярозы Картузскай, Брэста, Слоніма, Вілейкі і інш. Адзначым, што ў іншых навуковых публікацыях гэтая трагічная старонка ваеннай гісторыі Беларусі амаль не асвятляецца. Гэта значыць, што да сёння на тэрыторыі Беларусі могуць заставацца малавядомыя месцы, дзе адбывалася масавае знішчэнне людзей. Так, на месцы масавых расстрэлаў, эксгумацыі і спальвання трупаў забітых ва ўрочышчы Благаўшчына ў раёне Трасцянца першы помнік быў усталяваны толькі ў 2002 г., нягледзячы на тое, што ў гэтым урочышчы ў адпаведнасці з дакументамі НДзК было знішчана 150 тысяч чалавек.

## Даследаванне Енса Хофмана

Звернемся да малавядомай беларускаму чытачу кнігі Е.Хофмана "Пра гэта нельга казаць". "Акцыя-1005". Як нацысты ліквідавалі сляды сваіх масавых забойстваў ва Усходняй Еўропе"[18]. Гэтае фактычна першае спецыяльнае даследаванне, прысвечанае малавядомай тэме, было падрыхтавана на аснове дакументаў пасляваенных судовых працэсаў ці паліцэйскіх допытаў былых супрацоўнікаў "зондэркаманды 1005-Цэнтр", а таксама паказанняў жывых сведкаў у Германіі. Яго аўтар — нямецкі журналіст, які звярнуўся да разгляду тэматыкі на прыкладзе дзейнасці 17 зондэркаманд, у тым ліку "зондэркаманды 1005-Цэнтр". Е.Хофман заўважае, што адным з праблемных момантаў яго працы з дакументамі было тое, што служачыя судовых ці следчых інстанцый бачылі сваю галоўную задачу не ў дэталёвай рэканструкцыі гісторыі самой "акцыі 1005", а ў атрыманні звестак для тлумачэння дзеянняў падсудных. Нягледзячы на розныя перашкоды, Е.Хофману ўдалося рэканструяваць агульную карціну дзейнасці "зондэркаманды 1005-Цэнтр" спачатку ў зоне тылу групы армій "Цэнтр" (S. 139—170), а затым на астатняй тэрыторыі Беларусі з канца лета 1943 па пачатак лета 1944 г., у тым ліку ў раёне лагера смерці Трасцянец (S. 171—206).

Аўтару ўдалося паказаць малавядомыя старонкі гісторыі паўсядзённасці на тэрыторыі працоўнага лагера, які быў размешчаны побач з вёскай Малы Трасцянец, пры гэтым назваць імёны тых, хто знаходзіўся ў "камандзе смяротнікаў", каму пашчасціла застацца ў жывых і стаць сведкам жахлівых старонак гісторыі лагера смерці пад Мінскам (S. 198—202).

З тых, хто выжыў, аўтар першым называе Людвіга Гутмана — былога вязня працоўнага лагера, які па-




*Вокладка кнігі Е.Хофмана.*

сля вайны стаў адным са сведак на судовым працэсе супраць асобных удзельнікаў "зондэркаманды-1005". Е.Хофман прыводзіць біяграфію Л.Гутмана. Адзначае, што ён нарадзіўся ў 1902 г. у Вюрцбургу, дзе перад вайной гандляваў хатняй жывёлай. 24 лістапада 1941 г. разам з жонкай і сынам і іншымі амаль 1020 яўрэямі (мужчынамі, жанчынамі і дзецьмі) ён быў адпраўлены *"на Усход"*. Месцам прызначэння значылася Рыга. Праз 5 месяцаў, 8 мая 1942 г., ён разам з сябрам Тэа Дзёленфельдам быў дастаўлены цягніком з 34 галовамі буйной рагатай жывёлы ў Малы Трасцянец. Апроч іх з лагера Саласпілс у Трасцянец прыбыў і першы камендант лагера Г.Майвальд. Сябры апынуліся ў розных месцах. Тэа быў прызначаны адказным за правядзенне сельскагаспадарчых работ, а Л.Гутман павінен быў кіраваць жывёлагадоўляй у гаспадарцы мінскага СД у Трасцянцы. Л.Гутман на судовым працэсе ў 1962 г. сведчыў, што заставаўся ў лагеры Малы Трасцянец да ўцёкаў 29 чэрвеня 1944 г. На той момант у яго гаспадарцы было 127 кароў, 132 свінні, 70 коней, 300 авечак і інш. Працавалі ў ёй пераважна яўрэі, якія знаходзіліся ў працоўным лагеры. Працаваць даводзілася шмат, фактычна часу не заставалася для таго, каб даведацца пра іншыя падзеі ў лагеры. Аднак Л.Гутману давялося выдзяляць коней у распараджэнне мясцовых вязняў лагера, якія атрымалі заданне разам з сялянамі вёскі Малы Трасцянец і ваколіц нарыхтоўваць дровы для спальвання парэшткаў забітых ва ўрочышчы Благаўшчына (S. 200).

Сярод іншых фактаў, прыведзеных у працы Е.Хофмана, цікавыя звесткі, якія згадвае падчас судовага працэсу Л.Гутман у дачыненні да будынка для часовага знаходжання нямецкай ахоўнай каманды на тэрыторыі працоўнага лагера каля Малога Трасцянца. Менавіта ў гэтым будынку, узведзеным вясной 1942 г., размяшчалася "зондэркаманда-1005" не толькі ў час правядзення работ ва ўрочышчы Благаўшчына, але і пазней — да вясны 1944 г. З уліковай кнігі, куды штодзённа занатоўваў аб'ём выдадзенага малака Л.Гутман, ён ведаў аб назве гэтай каманды. Апроч таго, ён зразумеў, што з дзейнасцю гэтай каманды звязаныя слупы дыму, якія ўздымаліся на значнай адлегласці ад працоўнага лагера. У працы адзначаецца, што дакладных звестак аб абставінах удалых уцёкаў Л.Гутмана з лагера напрыканцы яго існавання разам з некаторымі іншымі вязнямі няма.

Другая асоба, якую згадвае аўтар, — Юлія Зебек, кіравала ў працоўным лагеры кухоннымі работніцамі. Яна нарадзілася ў Вене ў 1903 г., дзе і жыла да пачатку мая 1942 г. Да вайны яна працавала на хімічнай фабрыцы, дзе разам з ёй былі занятыя 120 жанчын і мужчын. Разам са сваёй сяброўкай сярод амаль 1100 яўрэяў яны былі адпраўленыя цягнікам з Вены *"на Усход"*. Ю.Зебек згадвала на судовым працэсе, што ніхто не казаў, куды канкрэтна накіроўваецца транспарт. 11 мая 1942 г. састаў з дэпартаванымі колькасцю каля 900 чалавек прыбыў у Мінск. Каля 200 чалавек не вытрымалі шляху і памерлі ў дарозе. Пасля прыбыцця пачалося апытанне ўсіх адносна іх прафесіі ці вопыту працы. Такім чынам, былі адабраныя каля 80 чалавек, якіх пагрузілі на адкрытую грузавую аўтамашыну і даставілі да адрыны ў лагер Трасцянец службы СД у Мінску. Па ўспамінах Ю.Зебек, яны нічога не ведалі пра тых, каго прымушалі садзіцца ў адкрытыя і закрытыя грузавыя аўтамашыны. Толькі пазней прасачыліся звесткі пра тое, што ўсе астатнія былі забітыя (частка ў спецыяльных газавых аўтамабілях) (S. 202).

Кажучы пра сваё знаходжанне ў працоўным лагеры, Ю.Зебек адзначае, што спачатку вязняў размясцілі ў хлявах, дзе яны начавалі да перасялення ў баракі, пабудаваныя для вязняў лагера. Там яны спалі на драўляных ложках, аддзеленых паміж сабой асобнымі сценамі з дошак. Ю.Зебек прыводзіць вельмі важныя звесткі аб кухні для вязняў лагера, дзе яна працавала да моманту ўцёкаў у канцы чэрвеня 1944 г. На кухні яна павінна была штодня гатаваць ежу для 600—900 чалавек — вадзяністы суп з сапсаванай бульбы з шалупіннем. Кожнаму вязню выдавалася ад 200 да 400 грамаў хлеба. Ю.Зебек адзначыла, што гэтая работа выратавала ёй жыццё.

Ю.Зебек сведчыла, што пасля іх размяшчэння штотыдзень прыбываў адзін ці два транспарты з Германіі, Вены ці Тэрэзіена. З кожнага транспарту ў лагер прывозілі ад 20 да 40 чалавек у якасці працоўнай сілы, астатніх адразу ж пасля прыбыцця забівалі. Сярод вязняў лагера вельмі хутка распаўсюдзілася інфармацыя пра газавыя аўтамабілі, якія часта прыбывалі ў лагер. Гэта былі дзве машыны, што дастаўлялі адзенне і абутак забітых яўрэяў. Кузавы іх даводзілася чысціць вязням лагера на беразе мясцовага возера. Чамаданы і іншыя каштоўныя рэчы дастаўляліся на грузавых аўтамашынах. Ю.Зебек згадвала і факты пра асобныя пакаранні смерцю вязняў лагера. Памяшканне кухні знаходзілася ў самым яго цэнтры, і з яго можна было бачыць месца, дзе часам адбываліся смяротныя пакаранні вязняў лагера праз павешанне. Павесілі і яе сяброўку з Вены, з якой яна прыбыла ў лагер. Ахвярамі сталі таксама некалькі вязняў, якія

паспрабавалі перадаць лісты сваім родным праз служачых будаўнічай арганізацыі "Тодта" і тыя, каго схапіла ахова пасля адбою. Ю.Зебек удалося выратавацца разам са старастам лагера Куртам Зайлерам. Яны здолелі збегчы разам з яго сям'ёй і 16 вязнямі літаральна ў апошні вечар. Як успамінае Ю.Зебек, пасля ўцёкаў яны хаваліся недалёка ад адной з вёсак, адкуль дзеці прыносілі ім ежу. Потым яна апынулася ў савецкіх лагерах у Краснагорску і Караган-дзе, з якіх вярнулася дадому ў Вену толькі ў сакавіку 1947 г. (S. 203—204).

У пералік аб'ектаў, якія згадвае Е.Хофман, трапіла таксама адрына, дзе ў канцы чэрвеня 1944 г. адбылося забойства вязняў працоўнага лагера Малы Трасцянец, мінскіх турмаў і лагераў. Нямецкі даследчык абапіраецца на звесткі, якія пасля вайны пакінулі С.І.Савінская і М.І.Валахановіч, якія цудам выжылі ў час расстрэлу ў адрыне. Паводле яго, расстрэлы адбываліся з 28 па 30 чэрвеня 1944 г., калі за тры дні да вызвалення Мінска ў адрыне лагера каля вёскі Малы Трасцянец былі забітыя і спаленыя 6500 савецкіх грамадзян (S. 198-199).

Апошнім сюжэтам, якім Е.Хофман завяршае разгляд дзейнасці "зондэркаманды 1005-Цэнтр" на тэрыторыі Беларусі, з'яўляецца ліквідацыя слядоў нацысцкіх злачынстваў у Слоніме і яго ваколіцах. Гэта адбывалася ў канцы чэрвеня. Для раскрыцця пахаванняў былі выкарыстаныя 50 вязняў адной з мясцовых турмаў, якіх старшы лейтэнант Гольдап паабяцаў (як і ў папярэднія разы перад пачаткам работ на месцы) вызваліць у тым выпадку, калі работы будуць завершаныя ў тэрмін. Для размяшчэння рабочай каманды падрыхтавалі спецыяльную зямлянку. Работы па нарыхтоўцы дроў і ліквідацыі слядоў на месцах злачынстваў вяліся да апошняга моманту, нават калі ўжо недалёка ад Слоніма з'явіліся часці Чырвонай арміі. Пасля рабочай камандзе было загадана зайсці ў зямлянку з-за небяспекі бамбардзіроўкі савецкімі самалётамі. Там яна была закрытая і заблакіраваная. Праз вентыляцыйныя шахты былі кінуты гранаты. Пасля гэтага рэшткі зямлянкі былі аблітыя бензінам і падпаленыя. Яны яшчэ дагаралі, калі вечарам 5 ліпеня 1944 г. "зондэркаманда-1005" пакідала Слонім. Адгэтуль яна адправілася ў Гродна. Праз 10 дзён каманда прыбыла ў польскі горад Ломжа (S. 205).

Нямецкі даследчык знаёміць чытача з такой "эгакрыніцай", як лісты Карла Фішэра, аднаго з удзельнікаў "зондэркаманды-1005" — былога паліцэйскага 9-й танкавай паліцэйскай роты, што забяспечвала ахову ва ўрочышчы Благаўшчына, калі там з 27 кастрычніка па 15 снежня 1943 г. праводзіліся работы па эксгумацыі і спальванні трупаў. З 205 лістоў, якія выкарыстоўваліся ў ходзе судовага працэсу ў Гамбургу, Е.Хофман аналізуе толькі 38, якія той адправіў сваёй жонцы з 15 верасня 1943 па 14 лістапада 1944 г. На думку аўтара, іх змест паказвае дэталі працоўнай паўсядзённасці. Так, 30 кастрычніка 1943 г. К.Фішэр нёс службу ў раёне ўрочышча Благаўшчына увесь дзень — з 6 гадзін раніцы да 9 гадзін вечара. З лістоў вынікае, што іх аўтар у складзе 4-га ўзвода 9-й паліцэйскай танкавай роты прыбыў у Трасцянец 27 кастрычніка 1943 г., якраз у дзень пачатку дзейнасці самой каманды ва ўрочышчы Благаўшчына. Яны размясціліся ў пабудове ў працоўным лагеры, дзе ім былі выдзеленыя два памяшканні на 15 чалавек кожнае. Аднак аўтар лістоў не забываў пра забарону згадваць звесткі пра работу "зондэркаманды 1005-Цэнтр", таму многія дэталі ў іх не раскрытыя (S. 212).

Дзякуючы знаёмству з названымі дзвюма нямецкімі працамі мы адкрываем малавядомыя месцы забойстваў на тэрыторыі Беларусі. Адзіным недахопам прыведзеных даследаванняў з'яўляецца тое, што з-за адсутнасці гістарычных дакументаў аўтарам не ўдалося вывесці агульную колькасць ахвяр, сляды якіх ліквідавала "зондэркаманда 1005-Цэнтр" у кожным з вышэйназваных месцаў Беларусі, і на іх падставе скласці дакладную тапаграфію нацысцкіх злачынстваў на беларускай зямлі.

Між тым у гэтых працах раскрываюцца асаблівасці масавых нацысцкіх злачынстваў у Беларусі ў гады германскай акупацыі 1941—1944 гг. Адзначым, што не ўсе згаданыя месцы злачынстваў на сёння сталі аб'ектамі калектыўнай і індывідуальнай памяці беларусаў. Больш за тое, пакуль мы застаемся ў кантэксце савецкай традыцыі памяці пра колькасць ахвяр, але часта не ведаем іх імёнаў. Кажучы пра лічбы ў дачыненні да розных месцаў памяці, нам неабходна звярнуць увагу на вельмі важны фактар ушанавання памяці ахвяр нацызму ў новым мемарыяльным комплексе "Трасцянец", дзе на месцы працоўнага лагера, а не ва ўрочышчы Благаўшчына, 28 сакавіка 2019 г. быў адкрыты помнік пад назвай "Масіў імёнаў". У той час як у беларускай частцы мемарыялу адсутнічаюць імёны тых, хто загінуў у Трасцянцы, аўстрыйскі і нямецкі пантэоны памяці складаюць канкрэтныя імёны знішчаных тут людзей. Як вядома, галоўнай мэтай дзейнасці "зондэркаманды 1005-Цэнтр" была ліквідацыя любых слядоў на месцах злачынстваў.

Падсумоўваючы вышэйсказанае адзначым, што нямецкія даследчыкі А.Ангрык і Е.Хофман: 1) зрабілі значны ўклад у вывучэнне трагічных падзей ваеннай гісторыі, назапасілі адметны фактапагічны матэрыял аб дзейнасці "зондэркаманды 1005-Цэнтр" у Беларусі ў 1943—1944 гг.; 2) распачалі новы этап у даследаванні малавядомых старонак ліквідацыі слядоў нацысцкіх злачынстваў у зоне тылу групы армій "Цэнтр" і на тэрыторыі, падпарадкаванай цывільнай адміністрацыі Генеральных акруг "Беларусь", "Жытомір" і "Валынь-Падолія"; 3) упершыню распавялі аб ходзе правядзення гэтай камандай спецыяльнай аперацыі па ўскрыцці, эксгумацыі і спальванні трупаў знішчаных людзей, у тым ліку яўрэяў з еўрапей-

скіх краін; 4) адкрылі новы кірунак германскай гістарыяграфіі ў даследаванні нацысцкай акупацыйнай палітыкі на акупаваных усходніх тэрыторыях, у тым ліку ў Беларусі; 5) запоўнілі прабел у даследаваннях нацысцкіх злачынстваў на акупаванай тэрыторыі Беларусі 1941—1944 гг.

Гэта сведчыць у тым ліку пра адсутнасць прац падобнага кшталту ў беларускай гістарыяграфіі, што ставіць у парадак дня айчыннай гістарычнай навукі задачу аб неабходнасці працягваць усебаковае вывучэнне ўсяго комплексу пытанняў гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, у тым ліку звязаных з нацысцкімі злачынствамі на тэрыторыі Беларусі. Адначасова варта задумацца аб выкарыстанні прыведзенай вышэй інфармацыі ў сферы навукі, навучання, выхавання, а таксама ў музейнай і экскурсійна-турыстычнай практыцы.

[1] Здановіч У.В. Беларусь у гады Вялікай Айчыннай вайны (1941—1945 гг.) у адлюстраванні айчыннай гістарыяграфіі: манаграфія. Брэст, 2008. С. 160—205; Здановіч У.В. Беларусь у гады Вялікай Айчыннай вайны (1941—1945 гг.) у адлюстраванні айчыннай гістарыяграфіі: дыс. ... д-ра гіст. навук: 07.00.09. Мінск, 2015; Беларусь в годы Великой Отечественной войны 1941—1945. Минск, 2005; Освобождение Беларуси 1943—1944. Минск, 2014; Страна в огне: В 3 т. Т. 3. Освобождение. 1944—1945: В 2 кн. Кн. 1. Очерки. Москва, 2018.

[2] Протокол допроса свидетеля П.Н.Головача, жителя Б. Тростенец Минского района от 19 июля 1944 г. // Преступления немецко-фашистских оккупантов в Белоруссии. 1941—1944 гг. Минск, 1965. С. 208—209; Из показаний жителя деревни Тростенец Н.С.Башко о лагере полиции безопасности и гибели в нем односельчан от 11 июля 1944 г. // Лагерь смерти Тростенец. Документы и материалы. Минск, 2003. С. 54—55; Из протокола допроса жителя деревни Малый Тростенец В.А.Буцевича 17 июля 1944 гг. // Трагедия народов Европы, память в Беларуси: документы и материалы. Минск, 2016. С. 71—75; Из протокола допроса жителя деревни Большой Тростенец П.Н.Головача от 19 июля 1944 гг. // Трагедия народов Европы, память в Беларуси: документы и материалы. С. 88—90; Из протокола допроса жителя деревни Малый Тростенец М.Г.Чернеты от 19 июля 1944 гг. // Трагедия народов Европы, память в Беларуси: документы и материалы. С. 90—92; Акт судебно-медицинского осмотра места расстрелов гитлеровцами населения в урочище Благовщина от 20-21 июля 1944 гг. // Трагедия народов Европы, память в Беларуси: документы и материалы. С. 93—94; Из заявления жителя дер. Присна Могилевского района С.И.Пилунова начальнику Белорусского штаба партизанского движения П.З.Калинину об уничтожении гитлеровскими захватчиками советских граждан, заключенных в могилевскую тюрьму, и о скрытии ими следов своих злодеяний за период с 15 сентября по 4 ноября 1943 г. // Преступления немецко-фашистских оккупантов в Белоруссии. 1941—1944 гг. С. 165—174.

[3] З Акта Гомельскай раённай камісіі аб злачынствах нямецка-фашысцкіх захопнікаў на тэрыторыі Гомельскага раёна ў 1941—1943 гг. ад 20 лістапада 1944 г. // Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Гомельскага раёна. У 2 кн. Кн. 1-я. Мінск, 1998. С. 246—249; Лемяшонак У.І. Акупацыйны рэжым // Памяць: Віцебскі раён. Гісторыка-дакументальная хроніка гарадоў і раёнаў Беларусі. Мінск, 2004. С. 219—224; Памяць: Гісторыка-дакументальная хроніка Гродзенскага раёна. Мінск, 1993; Разанблат Я.С. Акупацыйны рэжым на тэрыторыі Брэсцкага раёна // Памяць: Гісторыка-дакументальная хроніка Брэсцкага раёна. Мінск, 1998. С. 178—185.

[4] Из заявления жителя дер. Присна Могилевского района С.И.Пилунова... С.165—174.

[5] Там жа. С. 171.

[6] З матэрыялаў Надзвычайнай дзяржаўнай камісіі па расследаванні і ўстанаўленні злачынстваў нямецка-фашысцкіх захопнікаў // Памяць: Магілёўскі раён: Гісторыка-дакументальная хроніка гарадоў і раёнаў Беларусі. Мінск, 1996. С. 201.

[7] Акт Минской областной комиссии о массовом истреблении советских граждан на территории гор. Минска и его окрестностей немецко-фашистскими захватчиками в 1941—1944 гг. // Преступления немецко-фашистских оккупантов в Белоруссии. С. 222—227.

[8] Здановіч У.В. Беларусь у гады Вялікай Айчыннай вайны (1941—1945 гг.) у адлюстраванні айчыннай гістарыяграфіі. С. 160—178.

[9] Яцкевіч Н.А., Нікіцін М.Г. Трасцянец. Трагедыя народаў Еўропы = Тростенец. Трагедия народов Европы = Trastsianets. The tragedy of the peoples of Europe. Мінск, 2018.

[10] Gerlach Ch. Kalkulierte Morde. Die deutsche Wirtscahdfts- und Vernichtungspolitik in Weißrussland 1941 bis 1944. Hamburg, 1999.

[11] Angrick A. "Aktion 1005" — Spurenbeseitigung von NS-Massenberbrechen 1942—1945. Eine "geheime Reichssache" im Spannungsfeld von Kriegswende und Propaganda. In 2 Bde. Göttingen, 2018.

[12] Angrick A. Die Einsatzgruppe D // Die Einsatzgruppen der besetzten Sowjetunion 1941/42. Die Tätigkeits- und Lageberichte des Chefs der Sicherheitspolizei und des SD / Hrsg. von Norbert Kampe, Wolfgang Scheffler und Gerhard Schoenberner. Bd. 6. Berlin, 1997. S. 88—110.

[13] Paul Blobel // Kohl P. Das Vernichtungslager Trostenez. Augenzeugenberichte und Dokumente. Dortmund, 2003. S. 101.

[14] Gerlach Ch. Kalkulierte Morde. Die deutsche Wirtschafts- und Vernichtungspolitik in Weißrussland 1941—1944. S. 773.

[15] Erich Ehrlinger // Kohl P. Das Vernichtungslager Trostenez. Augenzeugenberichte und Dokumente. S. 101.

[16] Новікаў С. Урочышча Благаўшчына — месца масавага знішчэння людзей на тэрыторыі акупаванай Беларусі // Беларускі гістарычны часопіс. 2013. № 10. С. 21—27.

[17] Из справки начальника отдела Белорусской республиканской комиссии содействия в работе ЧГК СССР Г.Л.Логинова о массовом истреблении гражданского населения в окрестностях Минска в 1941—1944 гг. от 25 августа 1944 г. // Лагерь смерти Тростенец. Документы и материалы. Минск, 2003. С. 117.

[18] Hoffmann J. "Das kann man nicht erzählen". "Aktion 1005". Wie die Nazis die Spuren ihrer Massenmorde in Osteuropa beseitigen. Hamburg, 2008.

***Аўтар выказвае шчырую ўдзячнасць за інфармацыйную падтрымку навуковаму супрацоўніку Інстытута найноўшай гісторыі ў Мюнхене доктару гісторыі Юліі фон Зааль і дактаранту філасофскага факультэта Лейпцыгскага ўніверсітэта Крысціяну Ганцару.***